УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
________________ Ю.П.Бондар
"____" _________________2012 г.

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Менеджмент у сферы культуры

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-26 02 72 Менеджмент сацыякультурнай сферы
кваліфікацыя*: менеджэр у сацыякультурнай сферы*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі, зацверджаным
03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/201
(дата зацвярджэння, рэгістрацыйны нумар)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы:
М.М.Каралёў, дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

Навукова – метадычным саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

М*эта курса* – сфарміраваць у слухачоў прафесійныя арыентацыі для работы ва ўстановах культуры, арганізацыі вольнага часу і ажыцяўлення культурна-адпачынкавай дзейнасці ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах; авалодаць тэарэтычнымі асновамі эфектыўнага кіравання ўстановамі культуры розных тыпаў.

Змест курса ахоплівае звесткі пра агульныя прынцыпы менеджменту ў сацыякультурнай сферы; спецыфіку працы спецыяліста культуры; віды, узроўні і метады аналізу эфектыўнасці менеджменту ў сферы культуры; арганізацыйныя структуры кіравання ўстановай культуры.

Вывучэнне дысцыпліны "Менеджмент ў сферы культуры" забяспечвае слухачоў *ведамі аб*:

- менеджменце як кіраванні сацыяльна-культурнымі сістэмамі для атрымання пэўнага выніку па аднаўленні, захаванні, папулярызацыі і распаўсюджванні культурных каштоўнасцей;
- - тэндэнцыях ужывання перадавых спосабаў кіраўнічай дзейнасці, распаўсюджванні прадпрымальнасці, ініцыятывы, разумнага спалучэння прыватных і дзяржаўных інтарэсаў у сферы культуры;
- Магчымасцях прыцягнення розных крыніц для фінансавання культурных праектаў і праграм;
- - агульным механізме прыняцця кіраўнічага рашэння і асаблівасцях яго рэалізацыі ва ўстановах сферы культуры;

*кіраўніцкімі ўменнямі:*

- аналіз унутранага і знешняга асяродзя ўстановы культуры, яе жыццёвага цыкла; кіраўнічых працэсаў як паслядоўных дзеянняў па пераутварэнні рэсурсаў у рэзультат; арганізацыйнай структуры кіравання з рознымі спосабамі рэалізацыі паўнамоцтваў кіраўніка, яго паводзінаў;
- распрацоўка, выбар і рэалізацыя кіраўнічых рашэнняў, непарыўна звязаных з агульнымі функцыямі самога працэсу кіравання (планаванне, арганізацыя, актывізацыя, кантроль) і ўлікам адметнасцей творчых калектываў сферы культуры.

Пры выкладанні дысцыпліны мяркуецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы, праблемны, праектны метады навучання.

Самастойная праца слухачоў накіравана на развіццё пошуку неабходнай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры, газетных публікацый, радыё- і тэлеінфармацыі, інтэрнет-крыніц, творчае яе засваенне.

Праграма вучэбнай дысцыпліны разлічана на 100 газін: 48 гадзін аўдыторныя заняткі (у тым ліку 22 гадзіны лекцыі, 16 гадзін практычныя заняткі, 10 гадзін лабараторныя заняткі), 52 гадзіны самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – экзамен. Часткова экзаменацыйныя пытанні выносяцца на комплексны (сумесна з дысцыплінай "Рэклама і Паблік Рілейшнз у сферы культуры") дзяржаўны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэмы | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцыі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | самастойная работа |
| 1 | Дзейнасць як сацыяльная аснова менеджменту | 4 | 2 | | | 2 |
| 2 | Сацыякультурная сфера як аб'ект кіравання | 6 | 2 | | | 4 |
| 3 | Вытворчасць культурнага прадукту і асаблівасці кіравання | 8 | 2 | | 2 | 4 |
| 4 | Паняцце і мэты кіравання культурнымі працэсамі і іх рэгулявання | 4 | 2 | | | 2 |
| 5 | Месца і роля ўстаноў культуры ў грамадстве | 8 | 2 | 2 | | 4 |
| 6 | Механізмы кіравання ў сферы культуры | 8 | 2 | | 2 | 4 |
| 7 | Эфектыўнасць кіраўнічай дзейнасці ў сферы культуры | 8 | 2 | | 2 | 4 |
| 8 | Замежны і айчынны вопыт кіравання культурай | 8 | 2 | 2 | | 4 |
| 9 | Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы культуры | 8 | 2 | 2 | | 4 |
| 10 | Праграмна-мэтавае кіраванне ў сферы культуры | 6 | | | 2 | 4 |
| 11 | Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты менеджменту ў сферы культуры | 12 | 2 | 4 | | 6 |
| 12 | Статус і ролі менеджэра сферы культуры | 4 | | | 2 | 2 |
| 13 | Творчы калектыў як аб'ект кіравання | 4 | | 2 | | 2 |
| 14 | Кадравая палітыка ў сферы культуры | 12 | 2 | 4 | | 6 |
| | **Усяго:** | 100 | 22 | 16 | 10 | 52 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Тэма 1. Дзейнасць як сацыяльная аснова менеджменту

Суб'ект і аб'ект дзейнасці. Знешняя і ўнутраная дзейнасць. Тэорыя дзейнасці і сацыяльная практыка. Сацыяльна-культурная дзейнасць як стварэнне, засваенне, захаванне, распаўсюджванне і далейшае развіццё каштоўнасцей культуры.

### Тэма 2. Сацыякультурная сфера як аб'ект кіравання

Сацыякультурная прастора – матэрыяльныя структуры, сродкі вытворчасці, людзі, якія забяспечваюць сацыякультурнае развіццё. Асноўныя фактары, якія вызначаюць спецыфіку гаспадарчай, эканамічнай дзейнасці сацыякультурных устаноў.

### Тэма 3. Вытворчасць культурнага прадукту і асаблівасці кіравання

Паняцці «культурная каштоўнасць», «культурныя даброты», «культурныя прадукты». Узаемная абумоўленасць аб'ектаў фарміравання культурных патрэбнасцей. Рэгуляванне прапановы і попыту на прадукты культурнай дзейнасці. Аснова працы менеджэра сацыякультурнай дзейнасці – стымуляванне сацыякультурнай дзейнасці (мэтанакіраваны ўплыў на свядомасць асобы, актыўнае далучэнне да культурнай дзейнасці насельніцтва і др.).

### Тэма 4. Паняцце і мэты кіравання культурнымі працэсамі і іх рэгулявання

Дзяржава як паўнапраўны рыначны агент, які забяспечвае сацыяльныя запатрабаванні грамадства. Ролі дзяржавы ў кіраванні сацыякультурнай сферай, кіраўнічыя рычагі. Культурная вытворчасць і кіраванне. Рэгуляванне засваення культурных каштоўнасцей. Самарэгуляванне як найважнейшая ўласцівасць самаарганізацыі індывідаў і супольнасцей.

### Тэма 5. Месца і роля ўстаноў культуры ў грамадстве

Культура як самастойная частка народнай гаспадаркі, прастора сацыякультурнай практыкі, сукупнасць арганізацый і ўстаноў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры. Місія ўстаноў культуры. Інавацыйныя і традыцыйныя падыходы ў развіцці сістэмы кіравання сферай культуры. «Тэхналагічны» і «асобасны» падыходы ў арганізацыі дзейнасці ўстаноў культуры.

### Тэма 6. Механізмы кіравання ў сферы культуры

Механізмы менеджменту – адзінства мэт, функцый і сродкаў. Арганізацыйна-адміністратыўны механізм: сістэма размеркавання паўнамоцтваў, прававое рэгламентаванне; арганізацыйныя і штатныя расклады; аператыўнае кіраванне ўстановай культуры. Эканамічны механізм: сістэма рэсурснага забеспячэння і гаспадарчага ўтрымання; прынцыпы дзяржаўнага фінансавання сферы культуры; пазабюджэтныя крыніцы фінансавання. Персанал-арыентаваны механізм. Інфармацыйны механізм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 7. Эфектыўнасць кіраўнічай дзейнасці ў сферы культуры

Паняцці эфектыўнасці і эффекту кіравання ў сферы культуры, эфектыўнасці менеджменту. Сацыяльная эфектыўнасць як найважнейшая характарыстыка вынікаў культурнай дзейнасці. Характарыстыкі непасрэдных вынікаў кіравання ў сувязі з узроўнем арганізацыі вытворчасці і станам сацыяльна-псіхалагічнай атмасферы ва ўстанове культуры.

### Тэма 8. Замежны і айчынны вопыт кіравання культурай

Асноўныя прынцыпы ажыццяўлення культурнай дзейнасці, спалучэнне падтрымкі дзяржавы і самакіравання ўстановай культуры. Культурная палітыка як сістэмны атрыбут агульнадзяржаўнай палітыкі, выпрацоўкі сацыякультурных каштоўнасных арыенціраў, стварэння магчымасцей для культурнана самаразвіцця асобы, фарміравання грамадскіх рухаў у сферы культуры.

### Тэма 9. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы культуры

Структура кіраўнічых органаў культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Галоўныя функцыі Міністэрства культуры. Мясцовыя органы кіравання культурай. Дзейнасць спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры, вызначаныя Законам «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь».

### Тэма 10. Праграмна-мэтавае кіраванне ў сферы культуры

Сацыякультурнае праграміраванне як навукова абгуртаваны працэс стварэння новага ці перабудовы існуючага сацыякультурнага асяроддзя. Сацыяльна-творчы заказ як сродак рашэння сацыякультурных задач.

Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі беларусь да 2020 года.

### Тэма 11. Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты менеджменту ў сферы культуры

Сувязь тэорыі кіравання з навукамі аб чалавеку, аб развіцці асобы. Псіхалагічныя фактары эфектыўнага кіравання.Сацыяльная і ўзроставая псіхалогія. Улік асаблівасцей псіхалагічных працэсаў, механізмаў фарміравання пачуццёвага вопыту асобы ў культуратворчасці і кіраванні. Практычныя дзеянні спецыяліста культуры як вынік мэтанакіраванасці.

### Тэма 12. Статус і ролі менеджэра сферы культуры

Стылі кіравання, лідэрства як яго важны і эфектыўны механізмы. Ролевыя функцыі суб'ектаў сацыякультурных працэсаў.

Своеасаблівасць сацыяльных роляў спецыяліста культуры, творчы і рэпрадуктыўны характар выканання роляў. Спецыфічны характар узаемадзеяння менеджэра з выканаўцам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 13. Творчы калектыў як аб'ект кіравання

Калектыўныя формы арганізацыі працы ў сферы культуры. Відавая класіфікацыя прафесійных і аматарскіх калектываў. Каманда – новая форма ўзаемазалежнасці і падзелу адказнасці. Асаблівасці станаўлення і перспектывы развіцця творчага калектыву ў сферы культуры. Маральна-псіхалагічны клімат як інтэгральная характарыстыка творчага калектыву.

### Тэма 14. Кадравая палітыка ў сферы культуры

Кадравая палітыка – меры па стварэнні цэласнай сістэмы кадравых рэсурсаў, развіцця кадравага патэтцыялу, фарміравання кадраў культуры. Характарыстыка кадравай структуры галіны культуры ў адпаведнасці з напрамкам культурнай дзейнасці. Стымуляванне і матывацыя як аснова для развіцця партнёрскіх адносін унутры арганізацыі. Патрабаванні да работнікаў сферы культуры і праблемы іх падрыхтоўкі. Бесперапынная адукацыя спецыялістаў сферы культуры – працэс набыцця і паглыблення сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці на працягу ўсяго жыцця.

## ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Кіраванне як спецыфічная дзейнасць чалавека
2. Сутнасцть і змест менеджменту
3. Механізмы рыначнай эканомікі: зделка гаспадарчых суб'ектаў, дзейнасць інстытуцыянальнага асяроддзя
4. Характарыстыка сістэмы інстытутаў, якія вызначаюць фармальныя правілы
5. Уласнасць як адна з важнейшых састаўляючых кіравання
6. Інстытут рэгулявання ўзаемадзеяння асобных гаспадарчых суб'ектаў
7. Характарыстыкі арганізацыі (параметры, прызнакі, тыпы)
8. Эвалюцыя навуковай думкі ў сферы менеджменту
6. Функцыі, прынцыпы і метады менеджменту
7. Сутнасць кіравання, кіраўніцкія рашэнні
9. Арганізацыя як сістэма, знешняе і ўнутранае асяроддзе арганізацыі
10. Камунікацыі ў менджменце, упраўленчая інфармацыя: змест і класіфікацыя
11. Аўтарытэт і ўлада менеджера
12. Віды арганізацыйнай культуры, імідж арганізацыі
13. Патрабаванні да менеджера, стылі
14. Асаблівасці менеджменту сацыякультурнай дзейнасці
15. Механізмы менеджменту сацыякультурнай дзейнасці
16. Сацыяльна-культурная сфера як сфера паслуг
17. Кіраўнічая дзейнасць у сацыякультурнай прасторы
18. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сацыяльна-культурнай сферы
19. Тэхналогіі арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння сацыякультурнай дзейнасці
20. Прыцягнене і акумуляванне фінансавых сродкаў з розных крыніц
21. Сістэма работы з кадрамі сацыякультурнай дзейнасці
22. Праблема эфектыўнасці менеджменту сацыякультурнай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**


1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Афіцыйнае выданне.- Мн., Беларусь. 1997.- 92 с.
2. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» [Новая рэд.] // Нац. реестр правовых актов Республікі Беларусь.– 2004.– №87.– С.7-22.
3. Виханский О. С., Наумов А.И. Менеджмент.– М.: Экономистъ, 2004.- 288 с.
4. Кабушкин Н.И. Основы менеджмента.– М.: Новое знание, 2004.- 336 с.
5. Лафта Дж.К. Менеджмент: Учеб. пособие.- М.: ТК Велби, 2004.- 592 с.
6. Мескон М.Х., Альберт М., Хедоури. Основы менеджмента.– М.: Дело, 2005.- 720 с.
7. Основы менеджмента: Учеб. для вузов /Под ред. Д.Д.Вачугова.– М.: Высш. школа, 2001.- 367 с.
8. Основы менеджмента: Учеб.-практ.пособие / И.В.Балдин, Н.П.Беляцкий, Л.В.Дорошек и др.– Мн.: БГЭУ, 2002.- 112 с.
9. Словарь-справочник менеджера / Под ред.М.Г.Лапусты.– М.: ИНФРА-М, 1996.- 608 с.
10. Саркисов С.Э. Менеджмент: Словарь-справочник – М.: «Анкил», 2005.- 808 с.
11. Шепелев Е.М., Дятлов А.В. и др. Менеджмент.– Р.на/Д.: «Феникс», 2003.- 352 с.


**Дадатковая**


1. Беляцкий Н.П. Управление персоналом.– Мн.– Интерпрессервис, Экоперспектива, 2003. – 352 с.
2. Демчук М.И., Юркевич А.Т. Республика Беларусь: системные принципы устойчивого развития.- Мн.: РИВШ БГУ, 2003.– 342 с.
3. Казначевская Г.Б., Чуев И.Н. Основы менеджмента.- Ростов н/Д.: Феникс, 2004.- 384 с.
4. Клок К, Голдсмит Дж. Конец менеджмента и становление организационной демократии.– СПб.: Питер, 2004.– 368 с.
5. Коэн Ален Р.(ред.) Курс МВА по менеджменту.- М..: Альпина Бизнес Букс, 2004.- 507.
6. Огвоздин В.Ю. Краткий курс менеджмента: Учебное пособие. – М.: Изд. «Финпресс», 2004.-176 с.
7. Орлов А.И. Менеджмент в техносфере.– М.:Издательский центр «Академия», 2003.– 384 с.


РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Райзберг Б.А., Лозовский Л.Ш., Стародубцева Е.Б. Современный экономический словарь.- М.: ИНФРА-М, 1998.– 479 с.
9. Салмон Р. Будущее менеджмента / Под ред.Е.В.Минеевой.– СПб.: Питер, 2004.- 298 с.
10. Соколов А.В. Социальные коммуникации.– М.: ИПО Профиздат, 2001.– 224 с.
11. Суша Н.В. Основы менеджмента. – Мн.:Изд-во МИУ, 2004. – 176 с.
12. Феденя А.К. Основы менеджмента: Учеб. пособие / А.К.Феденя. – Мн.: Бестпринт, 2003. – 324 с.
13. Флиер А.Я. Исторические типы культуры / Культурология для культурологов. М.: Академический Проект, 2000, С.171-177
14. Янчевский В.Г. Основы менеджмента.- Мн.: ТетраСистемс, 2004.- 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ